аграномічнага справаводства ГААН – Б. Авенарыюс, абавязкі якога стаў сумяшчаць сам губернскі аграном П. Мінкоў [2].

На працягу 1909-1910 гг. у Гарадзенскай губерні адбывалася фармаванне штату супрацоўнікаў аграномічнай службы, якая ў наступныя гады набыла адносна сталую структуру. Для арганізацыі эфектыўнай дапамогі губерня была падзелена на ўчасткі, за якія адказвалі павятовыя аграномы, а таксама падпарадкаваныя ім памочнікі, старосты і спецыялісты. Колькасць усяго падначаленага губернскаму аграному персаналу сягала паўсотні чалавек. Адукацыйны цэнз быў вызначальным для заняцця пасады ў аграномічнай службе, што асабліва датычыцца павятовых аграномаў і іх памочнікаў, але здараліся і выключэнні. На жаль, большая частка аграномаў і іх памочнікаў не мела вялікага стажу працы ў губерні, што не магло не ўплываць на якасць іх паслуг.

**ЛІТАРАТУРА**

1. НГАБ у Гародні. Ф. 868. В. 1. спр. 58.
2. НГАБ у Гародні. Ф. 868. В. 2. спр. 6.

УДК 357. 23 (091) “1911” (476.76)

# ПА СТАРОНКАХ ЗАБЫТАГА ДАКЛАДА: ГАТУНКІ ПЛАДОВЫХ ДРЭВАЎ, РЭКАМЕНДАВАНЫХ ДЛЯ ГАРАДЗЕНСКАЙ ГУБЕРНІ Ў 1911 Г. АГРАНОМАМ ПАЎЛАМ КАТОВІЧАМ

**Галубовіч В. У.**
УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Сучаснаму гарадзенцу, як аматару, так і спецыялісту, не складана знайсці інфармацыю пра раяніраваныя гатункі пладовых дрэваў. Дастаткова звярнуцца да даведнікаў [1] ці пашукаць звесткі ў інтэрнэце [2]. Але так, зразумела, было не заўжды. Напрыклад, на пачатку мінулага стагоддзя толькі прадпрымаліся спробы сістэматызацыі дадзеных пра асартымент прыдатных для вырошчвання на Гарадзеншчыне гатункаў пладовых дрэваў. Сцвярджаць гэта можна на падставе каштоўнага тэксту з назвай “*Гатункі пладовых дрэваў, больш ці менш прыдатных у якасці гандлёвых для Гарадзенскай губерні*”, які выпадкова апынуўся у складзе адносна невялікай архіўнай справы, якая пераважна датычацца крэдытных сродкаў, якія планавалася выкарыстаць для ажыццяўлення аграномічных мерапрыемстваў у



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

Гарадзенскай губерні ў 1909-1910 гг. [3]. Сыходзячы са зместу і формы, гэта даведка ці паведамленне. Сам тэкст быў датаваны 5 чэрвенем 1911 г. Падрыхтаваны ён спецыялістам па садаводству Дэпартамента земляробства Гарадзенскай губерні Паўлам Васілевічам Катовічам.

Матэрыял складаецца з агульнага ўступу, пераліку гатункаў пладовых дрэваў, дадзеных пра вытворцаў саджанцаў, якія прапаноўвалі якасны пасадачны матэрыял і спіса аўтарытэтных даведнікаў для садаводства. Ва ўступе аўтар адзначыў, што аснову кожнага прамысловага саду складае невялікі шэраг пладовых дрэваў, а веданне "*рынкавых гандлёвых гатункаў для дадзенай мясцовасці ці губерні*" дазваляе перайсці ад бессістэмнага аматарскага і стратнага пладаводства да "*высокадаходнага прамысловага*" [3]. Далей, не прэтэндуючы на навуковае адкрыццё, П. В. Катовіч адзначаў, што галоўнымі патрабаваннямі пры выбары гатункаў пладовых дрэваў з'яўляюцца вынослівасць, непатрабавальнасць да глебы, устоўлівасць да пашкоджання насякомымі і грыбковымі хваробамі, добрае і максімальна ранняе плоданашэнне, нарэшце, попыт на плады на рынку. П. В. Катовіч канстатаваў, што большасць ці нават усе гэтыя асаблівасці можна высветліць толькі вопытным шляхам у канкрэтнай мясцовасці, і рэзюмаваў тым, што "*у Гарадзенскай губерні, як і па ўсёй Еўрапейскай Расіі, няма ні вопытных станцый, ні памалагічных садоў, дзе б вырашаліся гэтыя пытанні*" [3].

У выніку, адзіны вядомы П. В. Катовічу на той час шлях выхаду з тупіка палягаў на выкарыстанні доследу прыватных асоб. Сваю ўласную практыку, якая базавалася на назіраннях у Гарадзенскай і сумежных з ёй губернях, ён спалучыў з вынікамі 30-гадовых выпрабаванняў некалькіх соцень пладовых дрэваў, якія ажыццяўляў Антон Васілевіч Шыраеў у маёнтку Нізяны. Маёнтак гэты размяшчаўся ў 20-ці вярстах на поўдзень ад Ваўкавыска [3].

Сад А. Шыраева, па адзнацы В. Катовіча, знаходзіўся ў максімальна неспрыяльных для Гарадзенскай губерні ўмовах: там вымярзалі ўсе ранеты, пармены і пакутвалі нават вынослівыя гатункі груш. Гэта было выклікана неабароненасцю саду ад паўночных вятроў і сырой глiністай глебай. Але адначасова было адзначана, што тыя ж гатункі дрэваў у больш спрыяльных умовах (сухая пясчаная глеба і абароненасць ад вятроў) нават у некалькіх дзясятках вёрст на паўночны захад былі больш устойлівымі. Гэта прымусіла Катовіча заўважыць, што ў Гарадзенскай губерні пад сады належала аддаваць "*сухія і цёплыя глебы альбо ўзвышшы, але, па магчымасці, толькі абароненыя мясціны*" [3].

Паводле В. Катовіча, у Гарадзенскай губерні найбольш выгадна разводзіць ябланевыя сады восеньскіх і зімніх гатункаў, хаця бліжэй да



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

чыгуначных дарог і гарадоў ён дапускаў “*прыбытковасць*” нават летніх гатункаў [3]. Акрамя таго, ён улічваў спецыфічныя густы спажыўцоў, калі адзначаў, што на рынках Масквы і Пецярбурга канкурэнтнымі былі гладкія яблыкі – белыя ці жоўтыя з румянцам, а вось чырвоныя яблыкі там зусім не цаніліся, “*ідуць яны толькі ў Варшаву*” [3].

У асноўнай частцы тэкста П. В. Катовіч прапаноўваў пазнаёміцца з асартыментам падабраных ім і прыдатных для Гарадзенскай губерні гатункаў, зведзеных у ніжэй пададзенай табліцы.

Табліца – Пералік гатункаў пладовых дрэваў, падыходзячых для Гродзенскай губерні [3, арк. 67-67 адв.]

| | |
|---|---|
| Яблыні | Летнія: 1. Наліў Белы Прыбалтыйскі, альбо Астраханскае Белае паводле князя Анатоля Гагарына; 2. Ружовы летні рускі яблык; 3. Супелепскае; 4. Кальвіл Белы летні; 5. Ружовае Віргінскае.<br>Восеньскія: 1. Астраханскае чырвонае; 2. Цукровае Літоўскае; 3. Баравінка; 4. Цітоўка; 5. Крансельскае Празрыстае; 6. Восеньская Паласатка, ці Графеншцейскае (штрыфель).<br>Зімовыя: 1. Антонаўка; 2. Мантвілаўка (графа Носціц); 3. Каштэля; 4. Бойкен; 5. Пепінка Літоўская; 6. Малінавае Оберландскае.<br>*Асобна для паўднёва-заходняй часткі губерні Катовіч рэкамендаваў: 1. Ранет Ландсбергскі; 2. Зоры (для садоў, абароненых ад вятроў); 3. Ціролька белая; 4. Цудоўнае Баскопскае, ці ранет Манфорт; 5. Зімовы Залаты Пармен (Каралева ранет, “Паласаты Шафран”)* |
| Грушы | Летнія: 1. Хуткаспелка (Малгажатка); 2. Мускатка; 3. Лімонная; 4. Сапежанка; 5. Любіміца Клапа; 6. Доктар Гюйё.<br>Восеньскія: 1. Лясная Прыгажуня (для сухіх глебаў і абароненых ад вятроў садоў); 2. Прынцэса Марыяна, ці Салісбюры; 3. Добрая шэрая; 4. Бергамот Ганзеля.<br>*Для паўднёва-заходняй часткі губерні і на сухіх абароненых месцах: 1. Восеньская дзеканка, ці Белая Бэра; 2. Бэрэ Боск, ці Берэ (Масляная) Аляксандр; 3. Бэрэ Аляксандр Люкас.*<br>Зімовыя: 1. Бон-дэ-Малін (Неліс Зімовы), ці Алагірская Чорная; 2. Жазэфін-дэ-Малін; 3. Бэрэ Лігеля, Каперачка, ці Амарэт. |
| Слівы | 1. Італьянская ўгорка (венгерка); 2. Мясцовая ўгорка (венгерка); 3. Рэнклод Зялёны; 4. Каралева Вікторыя; 5. Рэнклод Альтана; 6. Ренклод Улена; 7. Мірабель Нансійская; 8. Мірабель малая. |
| Вішні | 1.Мясцовая (распаўсюджана ў Кобрынскім і Берасцейскім паветах); 2. Остгеймская; 3. Лотавая; 4. Уладзімірская, ці Радзіцелева; 5. Любская.<br>*Для паўднёва-заходняй часткі губерні і абароненых мясцін губерні: 1. Гонар (слава) Губена; 2. Ангельская ранняя; 3. Каралева Гартэнзія; 4. Імператрыца Яўгенія.* |
| Чарэшні | Для заходняй часткі губерні і ўвогуле спрыяльных мясцін: 1. Мясцовая ружовая; 2. Драгана жоўтая; 3. Чорная ранняя Варшаўская; 4. Чорная поздняя. *Гатункі, якія не прывабліваюць птушак: 1. Жоўтая Бютнера; 2.Сеянец Прыёркі, выведзены садаводствам Крысцера ў Кіеве.* |

Падкрэсленыя гатункі аграном рэкамендаваў высаджваць сотнямі і тысячамі, непадкрэсленыя – толькі па некалькі дрэваў. Звяртае на сябе



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

ўвагу наяўнасць у спісе шэрагу мясцовых гатункаў, некаторыя з якіх лічыліся найбольш прыдатнымі для губерні (асабліва гэта датычыцца вішань).

Акрамя таго, П. В. Катовіч лічыў мэтазгодным побач з чыгуначнымі станцыямі і гарадамі вырошчваць белую, чырвоную і асабліва чорную парэчку, але, у першую чаргу, суніцы (клубніцы), асабліва гатунку Нобль Лакстана, Шарпліс, У(г)орка пладародная і Вікторыя [3].

Паколькі, на меркаванне П. В. Катовіча, у Гарадзенскай губерні не было "*добрасумленных пітомнікаў*", то ён рэкамендаваў цэлы шэраг вытворцаў якасных саджанцаў з іншых губерній: 1. Зяленскі (Валынская губ.); 2. Гонгардт (Курская губ.); 3. Балабанаў (Курская губ.); 4. Паўленка (Кіеўская губ.); 5. граф Сіверс (Пскоўская губ.); 6. Спірыдонаў (Пскоўская губ.); 7. граф Замойскі (Седлецкая губ. – з пазначэннем аб выпісванні толькі паўкамлёвых дрэўцаў); 8. Мейер (г. Кіеў) [3].

Складзеныя П. В. Катовічам у 1911 г. рэкамендацыі былі адрасаваныя не толькі тым, хто меў неабходныя сродкі і дастаткова зямлі для вядзення садаводства ў прамысловых памерах, але і звычайным аматарам. Відавочна, што гэта быў даволі кампетэнтны адказ на запыт мясцовага грамадства, якое, на жаль, не атрымала па волі лёсу часу для працы ў накірунку, накрэсленым гарадзенскім аграномам.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Государственный реестр сортов сельскохозяйственных растений. – Минск, 2022.
2. www.sorttest.by.
3. НГАБ у Гародні. Ф. 868. В. 1. Спр. 58.

УДК 357. 23 (091) "1914" (476.6)

# СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЯ АДУКАЦЫЙНАЯ ПРАГРАМА ТАВАРЫСТВА "РУСКАЕ ЗЕРНЕ" Ў ГАРАДЗЕНСКАЙ ГУБЕРНІ Ў 1914 Г.: АДМІНІСТРАЦЫЙНЫ АЎРАЛ НАПЯРЭДАДНІ КАТАСТРОФЫ

**Галубовіч В. У.**
УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

На пачатку XX стагоддзя ў межах даволі шырокага спектра ініцыятыў па садзейнічанні сельскагаспадарчай мадэрнізацыі ў Расійскай імерыі сваю нішу спрабавалі заняць разнастайныя арганізацыі, створаныя пад выкананне задач Галоўнай Управы



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ